У красавіку 1912 г. арганізавана Мінскае таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі. Ініцыятарамі яго стварэння сталі прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі, зацікаўленыя ў правядзенні прыродазнаўча-гістарычных, этнаграфічных і археалагічных даследаванняў Беларусі і ўнеслі вялікі ўклад у пашырэнне краязнаўчай работы. У 1914 г. выйшаў першы і, на жаль, адзіны выпуск "Известий Минского общества любителей естествознания, этнографии и археологии".

У 1910 г. аднавілася дзейнасць Паўночна-Заходняга аддзела Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства, які праводзіў вялікую работу па вывучэнні археалогіі, этнаграфіі, геаграфіі краю. На працягу 1910—1913 гг. выйшлі чатыры нумары "Записок Северо-Западного отдела Императорского Русского географического общества" (рэдактар беларускі гісторык і археограф Д. І. Даўтяла).

Пытанні выхавання і адукацыі юнацтва разглядаліся на старонках часопісаў "Белорусский учительский вестник" (Магілеў, 1910—1911), "Педагогическое дело" (Гродна, 1911—1914), "Народное образование в Виленском учебном округе" (Вільня, 1901—1915), "Лучынка" (Мінск, 1914) і інш.

Усе галіновыя выданні Беларусі ў той ці іншай ступені выконвалі інфармацыйную, камунікатыўную і культурна-асветніцкую функцыі. З мэтай прапаганды ведаў часопісамі выкарыстоўваліся разнастайныя формы падачы матэрыялу: у іх публікаваліся арыгінальныя і перакладныя навуковыя і навукова-папулярныя артыкулы, нататкі практычнага характару, інфармацыйныя паведамленні, бібліяграфічныя матэрыялы. Многія часопісы былі забяспечаны ілюстрацыямі, што падвышала іх інфармацыйную каштоўнасць.

## Спроба недзяржаўнага выдання на Барысаўшчыне ў пачатку 20-х гадоў

*Марыя БЯСПАЛАЯ, канд. гіст. навук, дацэнт кафедры гісторыі і філасофіі Беларускага універсітэта культуры*

20-я гады — гэта перш за ўсё перыяд распрацоўкі асноўных накірункаў дзяржаўнай палітыкі ў эканоміцы і грамадскім жыцці. Важнае значэнне надавалася ідэалагічнаму зместу культурна-асветніцкай дзейнасці. На Барысаўшчыне адразу пасля заканчэння савецка-польскай вайны пачынаюць стварацца беларускія культурна-асветніцкія гурткі, сябрамі якіх былі пераважна настаўнікі.

Летам 1921 г. у Барысаве пачалі працаваць двухмесячныя настаўніцкія курсы, слухачы якіх утварылі гурток, які ў жніўні 1921 г. быў пераўтвораны ў Беларускую культурна-навуковую грамаду. Ініцыятарам яе стварэння і кіраўніком стаў Арсен Іваноў-Казельскі, які займаў пасаду загадчыка беларускага пададдзела ў аддзеле народнай асветы і меў дачыненне да самадзейнага тэатра. У праекце Статута прадугледжвалася: 1) вывучэнне асаблівасцяў і старажытнасці нашай Бацькаўшчыны; 2) выданне ўсіх новых твораў маладых аўтараў і перадрук старых выданняў. Праект быў адпраўлены ў Наркамат асветы і ў студзені 1922 г. зацверджаны наркомам У. М. Ігнатоўскім з выняткам параграфа аб выдавецкай дзейнасці. Здаецца, кіраўніцтва НКА прадбачыла немагчымасць займацца гэтай справай у тагачасных эканамічных умовах. Аднак грамадоўцы палічылі, што яны справяцца з матэрыяльнымі цяжкасцямі з дапа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

могаю розных арганізацый і грамадскасці. Гэтая надзея не пакідала кіраўніцтва гуртка амаль да канца 1922 г. На агульным сходзе грамадоўцы арганізавалі чатыры секцыі, выдавецкую ўзначаліў К.Ржэўскі. Выдавецкая секцыя пачала актыўна шукаць маладыя таленты і сродкі на друкаванне. На агульным сходзе секцыі ў красавіку 1922 г. было вырашана прыцягнуць да літаратурнай працы ўсіх вядомых грамадзе маладых беларускіх пісьменнікаў. З гэтай мэтай былі разасланы звароты наступнага зместу: “З пашанай звяртаемся да вас, каб Вы ўзялі ўдзел у супрацоўніцтве з намі ў выданні часопіса-зборніка “Наш край” прысланнем сваіх твораў, апісанняў, ураженняў, што дзеіцца навокал, звычаяў, абрадаў, запісаў народных песняў, баек, легенд, пагамонак, дыялектаў”.

З пошукам сродкаў таксама былі вялікія праблемы. Выдавецкая секцыя звярталася па дапамогу ў розныя ўстановы. У красавіку 1922 г. звярнуліся ў выканкам з выдавецкай праграмай. Гэтая праграма, мабыць, не задаволіла выканкам, і ён патрабуе ўдакладнення. І грамада паведамляе, што да друку падрыхтаваны: 1. Драматычныя творы (перадрук са старых выданняў і новыя), 2. Першы выпуск двухтыднёвіка. У стадыі падрыхтоўкі знаходзіліся: работа К. Лібкнехта “Павукі і мухі” і зборнік папулярных артыкулаў па сельскай гаспадарцы. Аднак выканкам адмовіў у сродках. Тады кіраўніцтва звяртаецца ў Наркамат асветы і просіць на выдавецкую дзейнасць крэдыт на 500 млн. Прòсьбу аб грашовай дапамозе накіравалі таксама ў Наркамат земляробства, абяцаючы выдаваць артыкулы па розных галінах сельскай гаспадаркі.

Пошук сродкаў ішоў і ў іншым накірунку. На агульным сходзе ў сакавіку 1922 г. вырашылі правесці збор грашовых ахвяраванняў па ўстановах, дзе працавалі сябры грамады, па падпісных лістах у межах правядзення Тыдня дапамогі беларускаму выдавецтву. Тады ж кіраўніцтва грамады папрасіла беларускі пададдзел разаслаць адозву ва ўсе беларускія культурна-навуковыя ўстановы павета аб дапамозе беларускаму выдавецтву праз збор сродкаў на выданне некалькіх кніжак з драматычнымі і літаратурнымі творамі. Быў аб'яўлены Тыдзень дапамогі беларускаму выдавецтву, на працягу якога прапаноўвалася збіраць ахвяраванні на выдавецкую справу, ставіць спектаклі на яе карысць. Напрыклад, на агульным сходзе групы “Вянок” у мястэчку Крайск было вырашана: дзеля пашырэння і развіцця беларускага выдавецтва кожнаму сябру ў пільным парадку заняцца зборам розных казак, песень і г.д. і адпрацаваны матэрыял адпраўляць у грамаду.

З Гасцілавіцкага гуртка прыйшла дапамога ў памеры два мільёны дзвесце рублёў, аднак гэтага, безумоўна, было вельмі мала. Да таго ж гэта была адзіная грашовая дапамога. З іншых гурткоў паведамлялі, што сабраць нічога не змаглі з прычыны вялікай беднасці вёскі. Шкрабы, знятыя з дзяржаўнага забеспячэння, адмаўляліся ад дапамогі грамадзе. Амаль ніякіх сродкаў не прынёс кубкавы збор на карысць выдавецтва, праведзены з дазволу выканкама. Калі пачалі адкрываць скарбонкі, то ў адной налічылі 192 рублі, у другой — 198, у трэцяй — 44 царскія рублі, 600 рублёў керанкамі, столькі ж думскіх. Прафсаюзы таксама адмовілі ў дапамозе. Прычына тая ж: цяжкае матэрыяльнае становішча сяброў.

І вынік аказаўся заканамерным — ідэя арганізацыі недзяржаўнага выдавецтва не ўвасобілася ў жыццё. А ў першай палове 1923 г. і сама Барысаўская беларуская навукова-культурная грамада перастала існаваць.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ